4. Михель, Д. Инфантицид (детоубийство) глазами образованного российского общества второй половины XIX – начала XX в. [Электронны рэсурс] / Д. Михель, И. Михель. – Рэжым доступу: https://secrethistory.su/1514-infanticid-detoubiystvo-glazami-obrazovannogo-rossiyskogo-obschestva-vtoroy-poloviny-xix-nachala-xx-v.html. – Дата доступу: 13.06.2019.

5. Радциг, С.И. История античной литературы [Электронны рэсурс] / С.И. Радциг. – Рэжым доступу: http://antique-lit.niv.ru/antique-lit/radcig-istoriya-drevnegrecheskoj-literatury/xii-evripid.htm. – Дата доступу: 13.06.2019.

6. Синило, Г.В. История немецкой литературы XVIII века: учеб. пособие / Г. В. Синило. – Минск: БГУ, 2012. – 400 с.

7. Супранкова, Т.С. Матывы фаўсціяны ў малой прозе М. Гарэцкага / Т. С. Супранкова // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца літаратурна-мастацкай і навуковай дзейнасці братоў Гарэцкіх): матэрыялы XXV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 22 чэрвеня 2017 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. беларус. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; рэдкал.: Р. Гарэцкі (акад. рэд.) [і інш.]. – Мінск: РІВШ, 2017. – С. 140–151.

8. Тронский, И.М. История античной литературы [Электронны рэсурс] / И.М. Тронский. – Рэжым доступу: http://antique-lit.niv.ru/antique-lit/tronskiy-i-m/index.htm. – Дата доступу: 13.06.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Святлана Сычова***
*(Мінск)*

## ВОБРАЗ БЕЛАРУСА Ў ЛІТАРАТУРЫ ПАЧАТКУ XX СТ. (ПАВОДЛЕ АПОВЕСЦІ М. ГАРЭЦКАГА “ДЗВЕ ДУШЫ” І П’ЕСЫ Я. КУПАЛЫ “ТУТЭЙШЫЯ”)

Літаратура пачатку XX ст. адыграла значную ролю ў станаўленні новай беларускай літаратуры. Гэта быў складаны час, час выпрабаванняў, асэнсавання, праверкі жыццёвай стойкасці чалавека як асобы. Адна з мэтаў, якую ставілі перад сабой пісьменнікі, гэта стварэнне вобраза беларуса. Беларус у творах паўстаў рознабакова.

Творы М. Гарэцкага і Я. Купалы адлюстроўваюць адзін час, лёсавызначальны для краіны і герояў. Калі ў творы Гарэцкага героі шукаюць сваё месца, то ў Купалы амаль усе прыстасоўваюцца да абставін. Час рэвалюцыі для Беларусі ўскладняўся вырашэннем нацыянальнага пытання на фоне сацыяльных пераўтварэнняў.

Так, у аповесці “Дзве душы” падмена сацыяльнага становішча Ігната і Васіля надае дадатковыя праблемы ў пошуках сябе. Прычым цікава, што панскі сын знайшоў сваё месца адразу, а мужыцкі вагаецца. На фоне пошукаў сэнсу жыцця Ігнатам Абдзіраловічам шырока прадстаўлена карціна тагачаснага палітычнага жыцця краіны.

Галоўны герой Ігнат Абдзіраловіч з’яўляецца яскравым прадстаўніком беларускага грамадства таго часу. Яго пошукі свайго месца сярод гэтага сутыкнення ідэй, поглядаў, палітычных сіл, вызначальных падзей сімвалізуюць шлях усёй беларускай грамады. Светапоглядныя блуканні і роздумы героя яскравей выяўляюць перакананні самаго аўтара. Можна сцвярджаць, што менавіта вобраз Абдзіраловіча дазволіў паказаць сутнаснае значэнне падзей для значнай часткі беларускага народа. Сацыяльнае становішча героя ўскладнёнае тым, што ён “мужык ў панах”, панскае дзіцё выхаванае сялянкай, дае магчымасць больш глыбока зразумець і адчуць трагізм тагачаснага становішча беларусаў. “І нічога заміляўся з усімі, хаця ж вознік быў не па кішані, хаця грошы было надта мала, і яго, зведаўшага ўсю салодкасць пралетарскага быцця (калі пагневаўся з бацькам), цяпер, у шынелі афіцэра, хаця і не лічаць, можа быць, за ворага, але не прымаюць і за свайго брата” [1, с. 11] Так аўтар паказаў тую частку беларусаў, якія хаця і былі часткай грамады, але ўнутрана адрозніваліся ад яе. Герой апынуўся ў становішчы ідэалагічна “нічыйнага”, таму не мог далучыцца ні да аднаго з бакоў, па сацыяльным становішчы – дваранін, матэрыяльна – фактычна прадстаўнік народу. Такая няпэўнасць стану дазволіла ўсебакова выявіць нацыянальны свет беларуса пачатку XX стагоддзя, засяродзіўшыся на ідэйных пошуках (матэрыяльны складнік нацыянальнага свету невыразна адлюстраваны).

У творы краіна паказана арэнай змагання паміж белымі і чырвонымі, багатымі і беднымі, каталіцызмам і праваслаўем. Безумоўна, гэтая барацьба пачалася не ў XX стагоддзі, аднак яскравей выявілася менавіта ў гэты вызначальны час, калі народ нібы атрымаў права выбару. Максім Гарэцкі не дарэмна апісвае беларускі сход, тым самым вызначаючы дзейсныя сілы. Сама арганізацыя, пачатак сходу выяўляюць адносіны народа, свядомаснае стаўленне да падзей. “Збраліся беларусы надта ж неакуратна і марудна” [1, с. 18] Па колькаснаму складу сход выглядаў даволі дзіўна: аўтар падкрэслівае, што там было шмат — забаўная штука”[1, с. 18]), які выступаў па-руску, гаварыў, што “у нас, у белоруссов, нет классовой борьбы”, што “мы все, от пана до Степана, как говорится, будем стоять за одно: тесный союз с Россией и законное наделение малоземельных крестьян землею” [1, с. 18]. Вобраз князя ўвасобіў тую частку правячай эліты, якая мела спадзяванне ўздзейнічаць на народ і правесці ліберальную ідэю класавага міру. Супрацьстаіць гэтай ідэі Ігнат Абдзіраловіч: “І цяпер вам кажуць: у вас няма змагання класаў перад агульным ворагам…<…>Яно ёсць, гэтае змаганне, яно павінна быць! Хто яго не прызнае, той не ведае холаду, голаду, а вы, вы…Падзівуйцеся на сябе і ўздумайце, што было! Вы бедны, убогі, вашы дзеці галодны, і няшчасны, і тысячы крыжоў укапалі вы па дарозе, уцякаючы з бацькаўшчыны…” [1, с. 19]. Істотна і тое, што падчас выступу Ігната на сходзе перад вачыма прайшоў вобраз каханай Алі, якая едзе ад яго разам з бацькамі і князем, такім чынам сцвярджаецца немагчымасць спалучыць асабістае шчасце і сапраўды шчырыя адносіны да сялян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Супрацьстаянне Гальшанскага і Абдзіраловіча прасочваецца ва ўсім: адносінах да народа, тагачасных падзей, асабістага жыцця і выяўляе два бакі нацыянальнага свету заможных беларусаў. Гальшанскі “не любіў сябраваць з афіцэрамі простага роду, дзеля таго што яны, зазвычай, нядобра ўзгадованы” [1, с. 16], яго стаўленне да народа вызначалася толькі асабістымі выгодамі і жаданнем максімальна захаваць сваё становішча. Яго светабачанне цяжка назваць сапраўды беларускім, таму што яно абязлічана, не мае якіх-небудзь выразных нацыянальных рысаў, разам з тым яскрава выяўляе свет заможных рэнегатаў, да якіх далучаюцца і Макасеі, з іх інтэлектуальнай невыразнасцю. Абдзіраловіч, захапляючыся Аляю, падсвядома разумее немагчымасць іх сумеснага шчасця, адчувае чужароднасць гэтых людзей. “І душа дваіцца. Дзве душы. Тая, што плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі, цяпер цвярдзее, але робіцца нядобраю, набірае ўсё болей нейкай калянасці і нават жорсткасці. Няхай сабе плача па нейкай паненцы. Ёй не шкода.. А тая, другая, падумала і здрыганулася” [1, с. 26].

Светапогляд Ігната ўвабраў як дасягненні навукі (атрымаў адукацыю), так і народную педагогіку (выхаваны на народнай глебе). Абдзіраловіч па свайму светаадчуванню блізкі традыцыйнаму беларусу з яго ўспрыманнем жыцця, ён абвострана адчувае несправядлівасць, неадпаведнасць лозунгаў існасці, бачыць іншы бок пераўтварэнняў. Менавіта таму ён увесь час шукае, невыразна адгукаючыся на розныя павевы часу: “Іншыя натуры, каб жыць далей і мець нейкі спакой, чуюць пільную патрэбу ў яснасці і добрай цямнасці ўва ўсім, што ёсць наваколі таксама ў сваім жыцці за астатні, пасля такога ж уразумення, час. Гэткіх натур найболей сярод славянаў і народаў Усходу. Яны патрабуюць нейкага здавальнення і спакою духу ў адносінах да ўсяго, што ёсць і што дзеецца на свеце” [1, с. 34]. Абдзіраловіч сустракае на сваім шляху прадстаўнікоў розных партый, спрабуе зразумець сутнасць іх дзеянняў, прыстасаваць да свайго разумення свету ў яго цэласнасці.

Сустрэча з Васілём у Маскве мела для Ігната вызначальнае значэнне ў фарміраванні яго адносін да падзей. Раней Васіль быў неклапатлівым, вясёла-няўважным пастухом, потым работнікам ў прудзе (млыне), а зараз – “паклоннік недалёчкай сацыяльнай рэвалюцыі” [1, с. 13], менавіта ён знаёміць з Гаршком, падштурхоўвае да разваг і вызначэння сваіх адносінаў да рэчаіснасці.

Іван Карпячонак Гаршок, або Карпавіч належыць да той “даўняй і немалой чарады выхаджэнцаў з беларускай вёскі” [1, с. 36], якая бегла ў свет у пошуках волі, долі, свайго месца. “Дужа псуе сабе кар’еру мужыцкі сын, калі няскора забываецца на хату бацькіну. Ташнуе тады немаведама чаго; у горадзе ходзіць як непрыкаяны, а дамоў прыедзе – да працы ахвоты не мае. Так і прамарудзіць задарма жыццё сваё: ні богу свечка, а ні чорту чапяла, ні пан, ні нашчанец, мужыцкі брат” [1, с. 38]. Так аўтар выкрыў адвечную праблему нацыянальнага свету беларусаў, якія ў большасці маглі прасунуцца ў жыцці толькі шляхам нацыянальнага вырачэння. Гаршчок сімвалізуе сабой тую частку беларусаў, якія імкнуліся да ўлады, забыліся пра свае карані, маральныя законы, увасобілі “той гатунак людзей-самавукаў, каторыя хоць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і вялікай высакосці даходзяць у мастацтве, палітыцы ці абы-якой навуцы, але назаўсёды застаюцца з нейкай хібаю ў самым грунтоўным, а дзеля таго неспадзёўкі і страшна лёгка зваліваюцца часам на самы дол чалавечай думкі" [1, с. 46]. Менавіта такія людзі былі запатрабаваны ў гэты няпросты час, менавіта яны выявілі тую свядомасную існасць беларускага свету, які плённа расцвіў падчас роскввту ідэі зліцця ўсіх нацый у адну. Максім Гарэцкі паказаў шлях такіх людзей да ўлады, іх уплыў на фарміраванне поглядаў вяскоўцаў, на падзеі, выкрыў заганнасць такога жыццёвага выбару (смерць героя). Праўда, даволі пафасным было само пахаванне ў параўнанні са смерцю, што таксама адлюстравала павевы тагачаснага жыцця.

Да вобразаў беларусаў-рэнегатаў далучаецца Гарэлік-Гарэшка, які быў тайным агентам вялікага маскоўскага хаўрусу "Вызваленне Расеі" і якога "як беларуса родам паслалі працаваць на Беларусь з вялікімі сумамі грошы і важнымі даручэннямі самага сакрэтнага характару" [1, с. 88]. Гэты вобраз выявіў светапогляд той часткі беларускага народа, якая не проста прыстасоўвалася да абставін, а свядома здрадзіла роднаму краю, працавала на знішчэнне яго самабытнасці.

Іншы бок беларускага свету ўвасобіў "вучыцель" Мікола Канцавы, які шчыра верыў, што "толькі на шляху нацыянальна-сацыяльным беларускае адраджэнне будзе пэўным і абхопіць шыбка й памысна вялізарныя масы беларускага сялянства. І не толькі сялянства, адылі й беларускага мяшчанства…" [1, с. 68]. Яго паплечнікамі выступаюць вучань Гарэцкага каморна-агранаміцкага вучылішча Сухавей, Іра Сакавічанка. Гэтыя маладыя людзі сімвалізуюць будучыню Беларусі.

Менавіта Іра вызваляе з "чразвычайцы" Канцавога і Сухавея, якіх абвінавачвалі ў контррэвалюцыйнай агітацыі і "шкоднай для бальшавіцкай уласці" прапаганды сярод сялян. Сустрэча з гэтымі героямі абудзілі ў Абдзіраловічы памкненні да спасціжэння сутнасці свайго роднага. Прычым знаёмства з Сухавеем не было плённым, а вось Канцавы і Сакавічанка здолелі прабудзіць парасткі нацыянальнай свядомасці. Ігнат Восіпавіч, тлумачыўшы Гаршчку і Гарэліку сваё самавызначэнне, сцвярджаў, што "як беларус патроху знаходжу сябе ў беларускай нацыянальнай і сацыяльнай свядомасці"[1, с. 90], выказваў свае меркаванні наконт улады народа: "Мне не ймецца веры ў магчымасць існавання самастойнай улады радоў нашага пралетарыяту і, наагул, камуністычнага ладу жыцця. Гэта пакуль утопія" [1, с. 20]. У аповесці аўтар паказаў шлях Ігната Абдзіраловіча да Беларусі праз аналіз і спасціжэнне рэвалюцыйных падзей, які пачаўся з разумення бязлітаснасці пралетарскага руху, яго нацыянальнай чужасці, дакладней нігілізму, ідэйных разваг, з'ўялення адчування сябе часткай гэтай сялянскай грамады, прычым канчатковага выбару на старонках твора няма.

Праз свядомасныя пошукі галоўнага героя аўтар выявіў разнастайныя бакі нацыянальнага свету беларусаў. Так, Гальшанскі, Макасеі ўвасабляюць дэнацыяналізаваную "эліту" беларускага грамадства; Гаршчок, Гарэшка – беларусаў-вырачэнцаў; Канцавы, Сухавей, Сакавічанка – сілы, здольныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адрадзіць родны край. Варта адзначыць асацыятыўна-гаворкія прозвішчы персанажаў, якія узмацняюць успрыняцце ідэй, звязаных з імі.

У аповесці даволі разгорнута і глыбока выявіліся асаблівасці беларускага свету пачатку ХХ стагоддзя. У час, калі ішло змаганне перш за ўсё за уладу, беларусы павінны былі вызначыць не толькі свае палітычныя прыхільнасці, а і процістаяць далейшай русіфікацыі, дэнацыяналізацыі. Аўтар праз вобраз Ігната, Васіля паказаў тых, на каго ўздзейнічалі розныя ідэалагічныя сілы, адлюстраваў і тое, што беларуская вёска жыла сваім асобным жыццём, і розныя пераўтварэнні яе нібы не тычыліся: “І няма яму абсалютна ніякай справы да ўсяго на свеце. Няхай княжыць і валадаець хто хоць, абы толькі дастаць во табачкі ды так крутка правезць яе дахаты, каб дайжа сусед не даведаўся аб тым і не прыйшоў пазычыць дробачкі” [1, с. 83]. Слушна адзначыў даследчык творчасці пісьменніка Мушынскі М.І., што “адным з канкрэтных момантаў якой (нацыянальна-адраджэнскай канцэпцыі) было імкненне раскрыць вытокі негатыўных момантаў у нацыянальным характары беларуса – момантаў, якія абумовілі грамадзянскую пасіўнасць, палітычную індыферэнтнасць народных мас у барацьбе за пабудову самастойнай дзяржавы” [2, с. 400].

Такім чынам, нацыянальны свет беларуса ў аповесці Максіма Гарэцкага “Дзве душы” паказаны двухбакова. Як і душа галоўнага героя, дваіўся гэты свет: з аднаго боку дамінавала жаданне знішчыць прыгнятальнікаў, з другога – непрыманне той жорсткасці; неабходнасць самавызначэння – разуменне таго, што “беларускім народам кіруюць цяпер бальшавіцкія камісары ўсякіх нацый, апрача беларускай” [1, с. 97]; адчуванне сваёй самастойнасці – адсутнасць рашучасці ў дасягненні мэты, а самае галоўнае – пэўная абыякавасць да падзей

Граф Гальшанскі, які “не любіў сябраваць з афіцэрамі простага люду”, імкнецца стаць на чале беларускага руху, сцвярджае, што ў беларусаў няма класавай барацьбы. Абдзіраловіч, які прысутнічаў на гэтым сходзе, выбег на трыбуну і паказаў, што гэта не так, выразна акрэсліўшы розніцу ў поглядах.

У п’есе “Тутэйшыя” Янкі Купалы падзеі закранаюць час, калі ў Мінску пастаянна мянялася ўлада. Героі прадстаўляюць розныя сацыяльныя і ўзроставыя групы. Кожны з іх паказвае пэўную частку грамадства: Дама, Поп, Спраўнік, Пан, Наста Пабягунская, Мікітавы настаўнік Гэнрых Мотавіч Спічыні, Лявон Гарошка, Аленка, Янка Здольнік, Усходні вучоны, Заходні вучоны. Варта звярнуць увагу на тое, што імёны гавораць самі за сябе.

Мікіта Зносак мяняе свае погляды адпаведна сітуацыі. Ён увасабляе той тып беларусаў, для якіх важным з’яўляецца матэрыяльны дабрабыт, а свае перакананні не маюць ніякага значэння. Трэба адзначыць і тое, што ён саромеецца сваіх каранёў. Яго маці Гануля гаворыць пра паходжанне з вёскі, даведваецца, што Лявон Гарошка іх сваяк, і шчыра іх прыймае. Мікіта хоча ўзняцца любымі шляхамі, лічыць, што “высокае обшчаство” дапаможа яму ў гэтым. Ён гатовы вучыць розныя мовы, выказваць супрацьлеглыя думкі, каб займаць паважанае, на яго думку, становішча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ганула Зношчыха перажывае за свайго сына, бачыць недарэчнасць яго паводзінаў, але не можа паўплываць на яго. Яна ўвасабляе большую частку простых людзей, якія не столькі ўдзельнічаюць у падзеях, колькі назіраюць за імі.

Наста Пабягунская, да якой заляцаецца Мікіта, імкнецца выдаць сябе замуж. Яна ўвасабленне той часткі жанчын, якія ўпрыгожваюць жыццё мужчын. Для іх абсалютна не мае значэнне, што адбываецца вакол, першасны гулянкі і захапленне імі. Наста разумее, што яе запатрабаванні можа задаволіць мужчына пэўнага чына, таму і ставіць умову Мікіце: ён павінен стаць асэсарам.

Дама, Поп, Спраўнік, Пан з’яўляюцца і знікаюць разам з немцамі як увасабленне акупацыйнага рэжыма.

Генрых Мотавіч Спічыні – настаўнік, прадстаўнік кансерватыўнага адукацыйнага кола. Ён ведае шмат моў, гатовы вучыць Мікіту размаўляць па-польску, па-руску, па-нямецку, а мовы беларускага народа не ведае. Так паказаны адукацыйная сістэма царскай Расіі, настаўніцтва далекае ад народа.

Яму проціпастаўлены Янка Здольнік, які ўвасабляе нацыянальны рух, беларускую ідэю, народную адукацыю. Менавіта таму ён і Аленка пажаніліся. Такім чынам сцвярджаецца, што ў іх ёсць будучыня.

Барацьба за розумы людзей паказана праз вобразы Усходняга і Заходняга вучоных, якія тлумачаць аднолькавыя факты па-рознаму, на якіх асабліва не звяртаюць увагу прысутныя.

Такім чынам Янка Купала, уздымаючы праблему тутэйшасці як прыстасаванства, адсутнасці самапавагі чалавека, паказаў шэраг тыпаў беларускага насельніцтва: прыстасаванцы, жанчыны на ўтрыманні, вышэйшае грамадства, айцы духоўныя, чыноўніцтва, вучоныя, настаўнікі, сяляне. Кожны з іх паводзіць сябе адпаведна сваім мэтам жыцця, якія яскрава выявіліся ў пераломны час гісторыі.

Творы М. Гарэцкага і Я. Купалы не толькі ўздымаюць блізкія праблемы існавання грамадства, але ў іх падобны лёс. Абодва творы доўгі час былі па-за ўвагай чытача. У аповесці і п’есе розныя магчымасці і сродкі раскрыцця праблем і вобразаў, аднак у творах шырока прадстаўлены розныя пласты грамадства, сцвярджаецца, што толькі нацыянальная ідэя можа аб’яднаць людзей і даць накірунак далейшага развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**

1. Гарэцкі, М. Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П’еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мн.: Маст.літ., 1990. – 629 с.

2.Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: У 4 т. Т.1. – Мн.: Бел. навука,1999. – 583с.

3. Купала, Я. Паэмы. Драматычныя творы. – Мн.: Маст. літ., 1989. – 494 с.

***Алена Ярмоленка***
*(Гомель)*

# ФІЛАСОФСКАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА ДАКУМЕНТАЛЬНА-МАСТАЦКІХ АПАВЯДАННЯЎ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЦЫКЛА "ЛЮСТРАДЗЁН")

Творчасць Максіма Гарэцкага ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя, па меркаванню літаратуразнаўцаў, адрозніваецца філасофскім падыходам да асэнсавання рэчаіснасці: "Максім Гарэцкі – адзін з пачынальнікаў беларускай экзістэнцыяльнай літаратурнай традыцыі. Глабальна асэнсоўваючы сітуацыю чалавека ў пачатку XX ст., выяўляючы найскладанейшую дыялектыку ўзаемаадносін людзей у свеце, эвалюцыю іх свядомасці, М. Гарэцкі распрацоўвае паралельна з еўрапейскай літаратурай праблему маральных меж, фармулюе канцэпцыю суадносін розуму і маралі, звяртаецца да пытання грамадства без Бога. Пісьменніка цікавілі не толькі сацыяльная тэматыка, але і шматлікія аспекты пазасацыяльнага ў чалавеку, свядома засяроджанага на сваім унутраным жыцці, уласных комплексах" [1, с. 25].

Празаічныя творы пісьменніка ўздымаюць комплекс анталагічных, аксіялагічных, сацыяльных і антрапалагічных праблем. Апавяданні 20-30-х гадоў вызначаюцца шырынёю ахопу філасофскіх пытанняў быцця чалавека, даследаваннем духоўных пошукаў асобы ў рэчышчы экзістэнцыяльнай праблематыкі, рэфлексіяй над катэгорыямі дабра і зла. Прыкладам для даследавання і вызначэння шэрагу маральна-філасофскіх праблем, у роўнай ступені значных для Максіма Гарэцкага і культуры XX-XXI стагоддзя служыць цыкл "Люстрадзён" напісаны ў канцы 20-х – пачатку 30-х гадоў. Згаданы цыкл важны для асэнсавання творчасці пісьменніка ў складаных гістарычных умовах пагаршэння грамадска-палітычнага клімату. У пачатку рэпрэсій Максім Гарэцкі даследуе сацыяльныя і пазасацыяльныя аспекты жыцця чалавека, у час панавання сацрэалізму асмельваецца на праяўленне экзістэнцыялізму ў беларускай мастацкай прозе, а менавіта, імкнецца да ўзмацнення суб'ектыўнага пачатку ў творчасці, павышэння ролі асобы, індывідуальнасці героя.

Цікавым аб'ектам для аналізу і параўнання могуць служыць надрукаваныя ў савецкіх часопісах 30-х гадоў XX стагоддзя і ненадрукаваныя ў 30-я гады апавяданні дакументальна-мастацкага цыкла "Люстрадзён". З васьмі твораў, прыведзеных у зборы твораў Гарэцкага, у 1930 годзе былі апублікаваны толькі два апавяданні – "Пагранічны інцыдэнт на Амуры" (часопіс "Маладняк") і "Прастуда містэра Рамзая" (часопіс "Чырвоная Беларусь"). Мастацкія творы пісьменніка "Пагранічны інцыдэнт на Амуры" і "Прастуда містэра Рамзая", на першы погляд, цалкам адпавядаюць патрабаванням пралетарскага рэалізму з яго арыентацыяй на народнасць, ідэйнасць і канкрэтнасць. Але і ў гэтых, падрыхтаваных для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ